ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ І ЛЮБОЎ ДА СПРАВЫ

Прэзідэнт падтрымаў кандыдатуру дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Беларусі Станіслава Зася на пасаду генсека АДКБ. На сустрэчы з ім кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў парадак дня работы ў АДКБ. Таксама Станіслаў Зась праінфармаваў Прэзідэнта аб перагаворах з лідарамі іншых краін — удзельніц арганізацыі.

«Я раней казаў, што быў не адзін кандыдат ад Беларусі. Але спыніўся на прапанаванні Зася, каб паказаць прыклад, што пара ўжо нам у гэтай арганізацыі перайсці ад назначэння адстаўных генералаў, — нічога дрэннага не хачу пра іх сказаць — да дзеючых маладых і перспектыўных, каб надаць значэнне гэтай арганізацыі. Тым больш што мы назначалі генералаў, якія ўжо даўно адышлі ад воінскай службы, ад палітыкі. А ўсё ж такі гэта ваенна-палітычная арганізацыя», — пракаментаваў кіраўнік беларускай дзяржавы. Таксама ён дадаў: «Натуральна, гэта адпавядае нашым крытэрыям падрыхтоўкі і назначэння кадраў: прафесіяналізм і любоў да той справы, якой ты будзеш займацца».

Аляксандр Лукашэнка афіцыйна падтрымаў назначэнне Станіслава Зася, падпісаўшы адпаведны праект рашэння Савета калектыўнай бяспекі АДКБ.

Пасля размовы з Прэзідэнтам Станіслаў Зась адзначыў, што на сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам былі выказаны мэтавыя ўстаноўкі, задачы. «Размова ў тым ліку пра больш практычную рэалізацыю пытанняў, якія стаяць перад арганізацыяй. Мы шмат за апошнія гады зрабілі ў плане нарматыўнай базы. Гэта вельмі важна, але час патрабуе канкрэтных практычных крокаў па ўмацаванні нашай агульнай бяспекі», — расказаў Станіслаў Зась.

З юбілеем!

СТАГОДДЗЕ З ІНФАРМАЦЫЯЙ

БелТА адзначыць свой юбілей 23 снежня. Штодня беларуская інфармацыйная служба праз навіны піша сучасную гісторыю краіны. Падчас урачыстага мерапрыемства ў Нацыянальнай бібліятэцы прадстаўнікі розных міністэрстваў і ведамстваў узнагародзілі супрацоўнікаў агенцтва ганаровымі граматамі.

Фота БелТА.

Уладзімір ЖАЎНЯК уручае грамату Аліне ГРЫШКЕВІЧ.

«Беларускае тэлеграфнае агенцтва з'яўляецца аператыўнай і дакладнай крыніцай навін пра падзеі ў Беларусі і ў свеце і па праве ўваходзіць у лік вядучых айчынных СМІ. Брэнд БелТА карыстаецца заслужанай павагай і даверам сярод шматлікіх замежных партнёраў, сумесна з якімі сёння паспяхова рэалізуюцца яркія медыяпраекты, ажыццяўляецца актыўны абмен перадавымі тэхналогіямі», — гаворыцца ў віншаванні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з нагоды 100-годдзя БелТА, якое на ўрачыстым мерапрыемстве ў Нацыянальнай бібліятэцы зачытаў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ЖАЎНЯК.**

«БелТА — гэта ў першую чаргу людзі, калектыў, — адзначыў **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** — Тое, як яны па крупінках збіраюць інфармацыю, якая запатрабавана іншымі СМІ, — найвялікшы прафесіяналізм, найвялікшая заслуга. Вялікі вам дзякуй за тое, што вы асвятляеце ўсе напрамкі развіцця нашай дзяржавы і фарміруеце хроніку нашай Беларусі».

Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, міністр інфармацыі, падкрэсліў: «Сотні навін штодня генерыруюцца ў інфармацыйную прастору, прыходзяць у інфармацыйныя і сацыяльныя сеткі, друкаваную перыёдыку. І гэта яшчэ не ўся ваша праца. Гэта і вялікі архіў фатаграфій, якім карыстаюцца тысячы тых, каму трэба скласці летапіс нашай краіны. Гэта і друкаваная перыёдыка, якую робяць супрацоўнікі вашага агенцтва, кнігі, якія паказалі, што вы яшчэ і сур'ёзнае выдавецтва. Безумоўна, гэта работа застанецца на стагоддзі».

Надзея АНІСОВІЧ.

ІМКНУЦЦА ДА ВЯРШЫНЯЎ

У Міністэрстве замежных спраў Беларусі адбылася цырымонія падняцця сцяга

Атрыбут знешнепалітычнага ведамства з учарашняга дня развяваецца на флагштоку побач з дзяржаўным сцягам каля будынка МЗС. Ва ўрачыстай цырымоніі ўдзельнічалі міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ, супрацоўнікі і ветэраны ведамства, прадстаўнікі дыпслужбаў, акрэдытаваных у Беларусі.

Заснаванне афіцыйнага сцяга МЗС міністр Уладзімір Макей параўноўвае з заснаваннем баявога сімвала вайсковай часці. «Кіраўнік дзяржавы часта кажа пра тое, што лічыць дыпламатычную службу важнейшай за ваенную. Так, мы сёння не змагаемся (і дзякуй богу) на полі бою са зброяй у руках, але мы вядзём, вобразна кажучы, баталіі на палітычнай, ваенна-палітычнай, эканамічнай, гуманітарнай і ў іншых сферах на розных міжнародных пляцоўках. Таму сцяг — гэта перш за ўсё сімвал патрыятызму, адданасці і вернасці кожнага з нас беларускай дзяржаве і народу. Сімвал той высокай планкі маральна-дзелавых і прафесійных якасцяў, якой неабходна адпавядаць дыпламатычным работнікам».

У сваёй прамове і ў інтэрв'ю для журналістаў ён адзначыў, што Беларусь будзе і далей умацоўваць свой суверэнітэт: «Калі спытаць, пераважная колькасць грамадзян нашай краіны адназначна скажа, што Беларусь павінна заставацца незалежнай і суверэннай дзяржавай. Пра гэты суверэнітэт і незалежнасць мы марылі, думалі на працягу многіх-многіх стагоддзяў. У нашай сучаснай гісторыі мы дабіліся гэтага, таму мы павінны і далей працаваць над умацаваннем нашага суверэнітэту. Зразумела, што, як кажа Прэзідэнт, гэта дорага каштуе, але мы павінны разумець гэта і павінны зрабіць так, каб кожны ўносіў уклад у гэты працэс».

Па словах Уладзіміра Макея, пунктамі, якія патрабуюць асаблівай увагі, для МЗС сёння з'яўляецца развіццё гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, палітычнага ўзаемадзеяння, прасоўванне ваенна-палітычных ініцыятыў з-за канфрантацыйнай напружанасці ў нашым рэгіёне. Беларусь павінна мець больш прыхільнікаў тых ідэй, якія выстаўляе наша краіна.

У будучым годзе знешнепалітычнае ведамства Беларусі будзе адзначаць векавы юбілей. Указам Прэзідэнта 16 кастрычніка 2018 года заснаваны геральдычныя сімвалы, узнагароды і дзень дыпламатычнага работніка — 22 студзеня. Менавіта ў гэты дзень у 1918 годзе ў газеце «Звязда» была размешчана першая публічная аб'ява аб пачатку дзейнасці Народнага камісарыята замежных спраў БССР.

Марыя ДАДАЛКА.

Фінансавая палітыка

Працэнтная стаўка будзе па-ранейшаму зніжацца

Стаўка рэфінансавання да канца наступнага года складзе 9—10 %, паведаміў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Павел КАЛАУР.

Фота БелТА.

НІ КРОКУ НАЗАД

Але ў канцы гэтага года Нацыянальны банк не бачыць прычын для карэкціроўкі цяперашняй манетарнай палітыкі. Працэнтныя стаўкі адпавядаюць макраэканамічнай палітыцы і ўлічваюць рызыкі на наступны год. Праўленне Нацбанка прыняло рашэнне захаваць стаўку рэфінансавання і працэнтныя стаўкі па аперацыях рэгулявання ліквіднасці на цяперашнім узроўні.

Па словах Паўла Калаура, фінансавы рэгулятар кіраваўся тым, што са жніўня гэтага года назіраецца паскарэнне інфляцыйных працэсаў. Дадатковыя выклікі для нацыянальнай эканомікі генеруе высокая нявызначанасць патэнцыялу знешніх шокаў і геапалітычная напружанасць у рэгіёне. Гэтыя фактары абмяжоўваюць магчымасць па змякчэнні манетарных умоў. Разам з тым значных падстаў для ўзмацнення жорсткасці таксама пакуль няма.

Акрамя таго, разглядаецца пытанне адмовы ад рэкамендацый гранічнага ўзроўню працэнтных ставак на крэдытна-дэпазітным рынку. Пры гэтым рэгулятарнае ўздзеянне на генерацыю банкамі павышаных рызык захаваецца. Яно будзе ісці праз сістэму спецыяльных інструментаў.

Мэтавы параметр па золатавалютных рэзервах на наступны год — 7,1 мільярда долараў. Адносна курсу беларускага рубля ў 2019 годзе Павел Калаур падкрэсліў, што ён будзе справядлівы.

ПРЫВЯЗКА ДА ВАЛЮТЫ — ПЕРАЖЫТАК МІНУЛАГА

Павел Калаур адзначыў, што эксперты банка падрыхтавалі прапановы па ўнясенні змяненняў у Грамадзянскі і Банкаўскі кодэксы, каб адысці ад прывязак да валютных эквівалентаў у дагаворах. Ён адзначыў, што, калі важна ў дагаворы забяспечыць захаванне пакупніцкай здольнасці рублёў, ёсць магчымасць прывязкі да інфляцыі. «Мы глыбока перакананыя ў правільнасці гэтых мер», — сказаў Павел Калаур.

Адказваючы на пытанне аб хуткасці прыняцця прапанаваных змяненняў, ён адзначыў, што «ўсё залежыць ад разумення гэтых працэсаў ва ўрадзе і парламенце». Павел Калаур падкрэсліў, што працэс дэдаларызацыі працяглы і залежыць ад макраэканамічнай палітыкі краіны, ад цэнавай і фінансавай стабільнасці. Для паспяховасці неабходныя давер і да Нацбанка, і да грашова-крэдытнай палітыкі ў цэлым.

ПРАБЛЕМА «ТАКСІЧНЫХ» ДАЎГОЎ

У нашай краіне падрыхтаваны праект указа аб рынку праблемных даўгоў. Ён прадугледжвае стварэнне роўных і зразумелых умоў гандлю для ўсіх удзельнікаў рынку, парадак гандлю імі на Беларускай валютна-фондавай біржы і надзяленне Агенцтва па кіраванні дрэннымі даўгамі новымі функцыямі. На гэтай тэме асобна спыніўся **намеснік старшыні праўлення Нацбанка Дзмітрый ЛАПКО.**

У прыватнасці, ён заявіў, што 26 снежня будзе пагаджальная нарада, і да канца года дакумент плануецца ўнесці ва ўрад. Дзмітрый Лапко падкрэсліў, што фінансавая стабільнасць — адзін з прыярытэтаў краіны, і банкаўскі сектар уносіць самы істотны ўклад у гэта. «Узровень дастатковага капіталу знаходзіцца на высокім узроўні, прыбытковасць не выклікае трывогі ў рэгулятара. Гранічны ўзровень па дрэнных актывах — не вышэй за 10 %», — адзначыў ён.

Для работы з праблемнымі даўгамі ў Беларусі ўжо зроблены пэўныя захады, у прыватнасці, прыняты ўказ № 200. «Гэта не банкам трэба ў першую чаргу, страты ўжо ўлічаны ў капітале. Гэта пытанне справядлівасці размеркавання рэсурсаў, пытанне ўздзеяння таксічных прадпрыемстваў на нармальныя, на тых, каму яны не плацяць», — падкрэсліў Лапко.

Расказваючы пра сутнасць дыскусіі вакол дакумента, намеснік старшыні звярнуў увагу на тое, што пытанне справядлівай цаны актыву складанае. «Мы прапануем аўкцыён, каб разумець, як цана будзе ўтварацца. Ёсць пытанне да першапачатковага дысконту, да дысконту па даўгах дзяржпрадпрыемстваў. Мы лічым, што правы ва ўсіх павінны быць роўныя. У тым ліку для дзяржпрадпрыемстваў».

Сярод ключавых удзельнікаў рынку рэгулятар бачыць Агенцтва па кіраванні актывамі, куды перададзены сельгаспрадпрыемствы, частка з якіх праходзіла санацыю, а частка актываў прызначалася на продаж. «Мы сваю задачу бачым у забеспячэнні правоў крэдыторaў. Гэта пераклікаецца з рэкамендацыямі Сусветнага банка, з тым, што мы не дабіраем балы ў рэйтынгу ацэнкі ўмоў вядзення бізнесу па пазіцыі «правы закладных крэдыторaў».

НАШЫ РАХУНКІ Ў ЗАМЕЖНЫХ БАНКАХ

Беларусам могуць дазволіць свабодна адкрываць бягучыя рахункі ў замежных банках з 1 сакавіка наступнага года. Гэта прадугледжана праектам дакумента аб змяненні ў заканадаўстве.

Цяпер ён праходзіць рэгістрацыю ў Міністэрстве юстыцыі. **Намеснік старшыні праўлення Нацбанка Сяргей КАЛЕЧЫЦ** звярнуў увагу, што забарону прапануецца зняць менавіта на адкрыццё ў замежных банках бягучых рахункаў, а каб адкрыць дэпазіт, прыйдзецца атрымліваць дазвол Нацбанка. У дакуменце ёсць і шэраг іншых навацый, у тым ліку ў плане дэдаларызацыі. Падрабязныя тлумачэнні аб навінах будуць размешчаны на сайце Нацбанка.

Нацыянальны банк мае намер праводзіць палітыку адкрытых і ініцыятыўных камунікацый, заснаваных на рэгулярным двухбаковым дыялогу з грамадскасцю. Гэты падыход замацаваны ў камунікацыйнай палітыцы, распрацаванай пры рэалізацыі твінінг-праекта Еўрапейскага саюза «Умацаванне патэнцыялу Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь» і зацверджанай праўленнем Нацбанка 19 снежня 2018 года. Асноўная мэта камунікацый — фарміраванне больш высокага ўзроўню даверу да Нацбанка.

Пры камунікацыях з грамадскасцю Нацыянальным банкам будзе ўлічвацца розны ўзровень эканамічных ведаў асобных сацыяльных груп і асаблівасці ўспрымання імі інфармацыі. Для гэтага ў камунікацыйнай палітыцы вызначаны асноўныя мэтавыя аўдыторыі, з якімі будзе найбольш актыўнае ўзаемадзеянне і на якія Нацбанк будзе арыентавацца пры падрыхтоўцы і распаўсюджванні інфармацыі.

Як паведаміў старшыня праўлення Нацбанка Павел Калаур, на сайце абнародуюць графік правядзення ў 2019 годзе пасяджэнняў праўлення па пытаннях грашова-крэдытнай палітыкі. Інфармацыя аб вынніках пасяджэння таксама будзе публікавацца.

Сяргей КУРКАЧ.

Маральна-этычныя калізіі

ФІЛАСОФСКІЯ ПРАБЛЕМЫ БІЯМЕДЫЦЫНЫ

Ці парушаюць новыя тэхналогіі правы чалавека?

У 1997 годзе на экраны выйшаў амерыканскі фантастычны фільм «Гатака». У ім расказваецца пра генетычна дасканалых людзей, якія займаюць у грамадскай іерархіі самыя высокія пазіцыі. Іх фізічная і інтэлектуальная дасканаласць фарміравалася яшчэ ў прабірках, прычым бацькі маглі заказаць і пол дзіцяці, і колер яго вачэй. А вось людзі, якія нарадзіліся звычайным шляхам (іх называлі «дзецьмі кахання»), сталі ў грамадстве людзьмі другога гатунку. Прайшло менш як 20 гадоў, а фантастыка ўжо пачала ўвасабляцца ў рэальнасць...

У канцы лістапада з'явілася інфармацыя аб тым, што ў Кітаі нарадзіліся першыя ў свеце дзеці з генетычна адрэдагаваных эмбрыёнаў: яна адразу трапіла ў топ сусветных навін. Паведамлялася пра дзвюх дзяўчат-блізнят, якія з'явіліся на свет у выніку экстракарпаральнага апладнення: кітайскі вучоны паспрабаваў сфарміраваць у іх устойлівасць да заражэння ВІЧ. Сусветная супольнасць жорстка раскрытыкавала этычны аспект работы генетыка, а кіраўніцтва Сусветнай арганізацыі аховы здароўя заявіла, што будзе створана група экспертаў для вывучэння этычных праблем і пытанняў бяспекі, якія цягне за сабой працэдура геннага рэдагавання. Кітайскі ўрад таксама загадаў часова спыніць даследчую дзейнасць людзей, якія займаюцца рэдагаваннем чалавечых генаў.

Біямедыцына і правы чалавека аказаліся ў цэнтры ўвагі міжнароднай канферэнцыі, якая была арганізаваная Міністэрствам аховы здароўя ў рамках супрацоўніцтва з Саветам Еўропы ў гэтай сферы.

Асоба, а не аб'ект для маніпуляцый

— Пытанні біяэтыкі заўсёды былі актуальныя для грамадства, а з развіццём высокіх тэхналогій у медыцыне, анестэзіялогіі і рэанімацыі, засваеннем тэхналогій трансплантацыі, выходжваннем неданошаных дзяцей, укараненнем дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій яны гучаць усё больш востра, — падкрэслівае **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі і экспертызы Міністэрства аховы здароўя, старшыня Камітэта па біяэтыцы Рэспублікі Беларусь Алена БОГДАН.** — Беручыся за распрацоўку змяненняў у закон «Аб ахове здароўя», які будзе змяшчаць раздзел, прысвечаны дзейнасці Камітэта па біяэтыцы, мы павінны прадумаць, як правільна выкласці яго кампетэнцыі і зрабіць наш голас больш важкім, бо шмат пытанняў застаецца па-за ўплывам камітэта.

Вылучаюцца чатыры асноўныя прынцыпы біяэтыкі: прынцып павагі чалавечай годнасці, прынцып «рабі дабро і не рабі зла», прынцып прызнання аўтаноміі асобы і прынцып справядлівасці. Правілаў таксама чатыры: праўдзівасць, прыватнасць, недатыкальнасць прыватнага жыцця і добраахвотная інфармаваная згода. У сукупнасці яны ўтвараюць, якія этычныя каардынаты прымушаюць бачыць у пацыенце ў першую чаргу асобу, а не аб'ект для назірання, эксперыментавання і маніпуляцыі.

Пакуль не позна

Ацэнкай этычных і прававых пытанняў у сферы біямедыцынскай навукі і тэхналогій у Еўропе займаецца Камітэт па біяэтыцы (DH-BIO), у які ўваходзяць прадстаўнікі 47 дзяржаў: эксперты з розных сфер, у тым ліку правоў чалавека, біялогіі і медыцыны. Не сакрэт, што на адну і тую ж праблему медыкі і юрысты глядзяць кожны праз прызму сваёй дысцыпліны. І як жа наладзіць дыялог паміж імі?

Апошнім часам філасофія сусветнай медыцыны ўсё часцей звяртаецца да тэмы жыцця і смерці.

— Што азначае права на жыццё і права на самастойнасць (аўтаномію)? — разважае **віцэ-прэзідэнт Камітэта па біяэтыцы Рытва ХАЛІЛА.** — Аўтаномія — гэта права пацыента на ўдзел у прыняцці рашэнняў па пытаннях яго здароўя, права адмовіцца ад медыцынскага ўмяшання ці пагадзіцца на яго. У выпадку адмовы — права на іншы, абгрунтаваны з пункту погляду медыцыны, метад лячэння. Гэта таксама права на адмову ад любога лячэння. Чалавек таксама мае права распарадзіцца наконт падтрымання жыцця: загадзя агучыць сваю пазіцыю наконт таго, як з ім трэба паступіць у выпадку, калі ён сам будзе не ў стане выказаць сваю волю. І такія распараджэнні павінны быць выкананы, калі няма падстаў меркаваць, што пацыент мог змяніць сваё меркаванне або яго распараджэнне аб падтрыманні жыцця было складзена на падставе непраўдзівай ці састарэлай інфармацыі.

Канешне, да права пацыента адмовіцца ад лячэння многія ставяцца рэзка адмоўна. Прагучала думка, што права на аўтаномію (у дадзеным выпадку адмову ад любога лячэння) падыходзіць для любой сферы, але толькі не для медыцыны. Нярэдкія выпадкі, калі пацыент, якому ставіцца анкалагічны дыягназ на першай ці другой ступені захворвання і які мае высокія шанцы на выздараўленне, адмаўляецца ад лячэння. Зноў звяртаецца па дапамогу праз чатыры-пяць гадоў ужо на чацвёртай стадыі хваробы. **Дык ці павінны ўрачы задавальняць волю пацыента? Пытанне зусім не рытарычнае... Ці іх абавязак рабіць усё, каб дзейнічала права на жыццё?** Увогуле, ці ўваходзіць права на смерць у права на жыццё або смерць з'яўляецца адмаўленнем жыцця? Многія медыцынскія работнікі лічаць, што чалавек мае права распараджацца сваім целам да таго моманту, пакуль няма прамой пагрозы яго жыццю. Дарэчы, эўтаназія дазволена сёння толькі ў лічаных краінах свету, а ў большасці дзяржаў яна забаронена пад страхам крымінальнага пакарання. Але ж размова ідзе не пра самазабойства, а толькі пра права чалавека сысці без пакут і болю...

Новай з'явай можна лічыць бодыхакінг — стварэнне ідэальнага «я». Яго прыхільнікі разглядаюць сваё цела як аб'ект, які можна змяняць і трансфармаваць, ужыўляць у яго розныя працэсары і датчыкі, замяняць здаровыя органы на імпланты, якія маюць больш шырокія функцыянальныя магчымасці. І тут таксама ўзнікае пытанне: **а ці можа дзяржава ўстанавіць нейкія абмежаванні для ахвотных ператварыцца ў кібаргаў?**

HELP для медыкаў і юрыстаў

Сёння на парадку дня ў беларускіх медыкаў стаіць работа над новым раздзелам «Электронная сістэма аховы здароўя» у законе «Аб ахове здароўя». Інфармацыя аб пацыентах у найбліжэйшыя гады будзе пераведзена ў электронны фармат, а папяровыя носьбіты заменяць інтэграваныя электронныя карты.

— І вось тут мы сутыкнёмся з вельмі складанай для нас на сёння праблемай — доступам пацыента да поўнай інфармацыі аб яго здароўі, — канстатуе Алена Богдан. — Яе каштоўнасць для кожнага з нас зразумелая. І мы будзем несці адказнасць за захаванне персанальных даных.

Хто можа даваць інфармаваную згоду за пацыента без прытомнасці? Ці можна паведамляць вынікі генетычнага тэсціравання сваякам? Як забяспечыць канфідэнцыяльнасць даных пра здароўе? Хто можа карыстацца паслугамі ЭКА і сурагатнага мацярынства? Як абараніць правы медработнікаў? Пытанняў вельмі шмат. Укараненне новых медыцынскіх тэхналогій, правядзенне клінічных даследаванняў — гэта сферы, у якіх пастаянна сутыкаюцца інтарэсы асобных людзей, супольнасцяў і дзяржавы. А біямедыцынская этыка закліканая абараніць правы кожнага з бакоў.

У рамках канферэнцыі адбылася прэзентацыя **бясплатнага анлайн-курса HELP па правах чалавека ў сферы біямедыцыны,** які можа быць вельмі карысным як для медыцынскіх работнікаў, так і для юрыстаў. Ён быў распрацаваны ў 2018 годзе Еўрапейскай праграмай навучання ў галіне правоў чалавека для прадстаўнікоў юрыдычных прафесій сумесна з Камітэтам па біяэтыцы Савета Еўропы.

Добраахвотная інфармаваная згода, урачэбная тайна і абарона даных аб здароўі пацыента, абарона эмбрыёна і рэпрадуктыўныя тэхналогіі, завяршэнне жыцця, біямедыцынскія даследаванні, трансплантацыя органаў і тканак — усе гэтыя пытанні разглядаюцца ў рамках сертыфікаванага курса па біяэтыцы.

Курс быў перакладзены на рускую мову. На постсавецкай прасторы наша краіна першая атрымала магчымасць працаваць з HELP, адаптаваўшы яго да нацыянальнага заканадаўства і нашых праблем. Ён таксама можа быць паспяхова выкарыстаны ў якасці навучальнага матэрыялу студэнтамі, якія вывучаюць медыцыну або права, супрацоўнікамі камітэтаў па этыцы і нацыянальных праваабарончых арганізацый. Курс будзе даступны на платформе электроннага навучання HELP у пачатку 2019 года па спасылцы http://help.elearning.ext.coe.int.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Дарэчы, гэтай восенню на базе БелМАПА былі арганізаваны першыя курсы павышэння кваліфікацыі «Этыка-прававыя асновы клінічнай медыцыны і біямедыцынскіх даследаванняў», якія выклікалі вялікую цікавасць з боку медыцынскіх работнікаў. Быў створаны Рэспубліканскі цэнтр біяэтыкі. Таксама сёлета ўпершыню прайшоў рэспубліканскі конкурс студэнцкіх работ «Даступная біяэтыка». Ён дапамог уцягнуць у абмеркаванне біяэтычнай праблематыкі моладзь з усёй краіны: не толькі медыкаў, але і будучых юрыстаў, філолагаў, архітэктараў, інжынераў і аграномаў. На конкурс паступіла 160 эсэ, 140 плакатаў і 27 відэаролікаў. А яго пераможцы былі запрошаны з навучальным візітам у Страсбур.

НАПЯРЭДАДНІ ПАДЗЕІ

Ад Расіі да Японіі

На чэмпіянат Еўропы па фігурным катанні ў Мінску балельшчыкі прыедуць з усяго свету, да старту турніру засталося крыху больш за месяц, а палову білетаў ужо купілі замежнікі.

Больш за ўсё замежных балельшчыкаў прыедзе з Расіі (80 % ад усіх замежных продажаў). На другім месцы краіны Еўрасаюза (12 %), прычым найбольш актыўнымі з іх аказаліся Вялікабрытанія, Латвія і Германія. На трэцім месцы Украіна (7 %). Ёсць продажы і за межамі Еўропы — на чэмпіянат прыедуць аматары з Японіі, Кітая, Чылі і іншых краін.

— Мы бачым сур'ёзную цікавасць да чэмпіянату Еўропы ў Мінску. На турнір прыедуць наймацнейшыя фігурысты кантынента, а цэны на білеты ў нас — самыя даступныя за апошнія дзесяць гадоў, — адзначае **Юлія КОМЛЕВА, старшыня Беларускага саюза канькабежцаў.**

Цырымонія адкрыцця чэмпіянату — 23 студзеня. Спаборніцтвы будуць праходзіць з 23 студзеня да 26 студзеня ўключна. 21 і 22 студзеня гледачы змогуць наведаць афіцыйныя трэніроўкі. Закрые чэмпіянат 27 студзеня гала-канцэрт з удзелам прызёраў спаборніцтваў.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

САМЫЯ СУЧАСНЫЯ АПЕРАЦЫІ

Пасля рэканструкцыі ўрачыста адкрылі аддзяленне траўматалогіі і артапедыі Брэсцкай абласной бальніцы.

Аддзяленне траўматалогіі і артапедыі справіла наваселле. Урачы і пацыенты пераехалі ў поўнасцю абноўленае і аснашчанае па-сучаснаму памяшканне. Умовы лячэння хворых і работы персаналу сталі непараўнальна лепшымі. Калідоры, палаты, лячэбна-працэдурныя памяшканні вылучае стыльны дызайн у бела-шэрых адценнях, а цяпер яшчэ і ў навагоднім афармленні.

Як паведаміў **галоўны ўрач бальніцы Аляксандр КАРПІЦКІ,** затраты на рамонт аддзялення склалі каля 380 тысяч рублёў. Цяпер тут стала магчыма размясціць 45 ложкаў у трохмесных палатах з санвузламі. Ёсць і палаты павышанай камфортнасці.

За год у названым аддзяленні праводзіцца каля 1100 аперацый, з іх 200 высокатэхналагічных і 200 складаных. Разам з навукоўцамі брэсцкія траўматолагі ўкаранілі дыферэнцыраваны падыход да лячэння астэаартрозаў буйных суставаў. За год выконваецца да 500 аперацый па пратэзаванні буйных суставаў. Урачы аддзялення выязджаюць таксама ў бальніцы горада і вобласці для аказання экстраннай дапамогі. Траўматолагі-артапеды пастаянна павышаюць свой узровень на базе айчынных і замежных клінік. Паводле слоў **загадчыка аддзялення Сяргея КІСЯЛЯ** *(на фота),* плануецца пашыраць спектр медыцынскіх умяшанняў. Маецца на ўвазе ўвядзенне прэпаратаў пад кантролем ультрагукавога даследавання, для гэтага закуплены УГД-датчык. У планах на наступны год — прымяненне клетачных прэпаратаў — ад ствалавых клетак да клетак коснага мозгу — для лячэння артапедычнай і траўматалагічнай паталогіі.

Вядома, такому аддзяленню было вельмі патрэбна сучаснае памяшканне. І яно яго атрымала.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.